**Варыянт 1**

1. Якая з прыведзеных планет мае найбольш шчыльную атмасферу?
   (a) Зямля
   (b) Венера
   (c) Плутон
   (d) Меркурый
   (e) Марс
2. Што такое сузор'е (у сучасным разуменні)?
3. Як утвараецца слабая кіслародная атмасфера ў спадарожнікаў Ганімед і Еўропа?
4. Праз які час паўтараюцца верхнія злучэнні Меркурыя, калі ён мае сідэрычны перыяд $T = 88,0$ сут (арбіту Меркурыя лічыць кругавой)?
5. Вызначыце шырыню метэорнага рою Драканіды (у а.а.), калі ён дзейнічае з 6 па 10 кастрычніка.

**Варыянт 2**

1. Якое з прыведзеных сузор'яў не з'яўляецца экліптычным?
   (a) Шалі
   (b) Авен
   (c) Змеянос
   (d) Рак
   (e) Арыён
2. Якая прычына месяцавых зацменняў?
3. Што такое металічны вадарод?
4. Чаму роўны перыяд абарачэння астэроіда Беларусь, калі вялікая паўвось ягонай арбіты $a_1 = 2,405$ а.а.?
5. Які прамежак часу паміж процістаяннямі і ўсходняй квадратурай Марса (арбіту Марса лічыць кругавой з радыусам $1,524$ а.а.)?